# «Універсітэт і гэты баль буду ўспамінаць з цеплынёй»

**Модныя сукенкі, строгія касцюмы, прыгожыя прычоскі і макіяж і, самае галоўнае, дыплом аб вышэйшай адукацыі. Рэспубліканскі баль выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі сабраў найлепшых маладых спецыялістаў. Яны шчыра падзяліліся не толькі сваімі ўражаннямі ад цудоўнага вечара, але і планамі на будучыню.**



Фота БелТА.

**Дар'я ДУБОЎСКАЯ, выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,** расказала, што плануе працягваць вучобу ў магістратуры і аспірантуры, каб у будучыні рэалізоўваць цікавыя праекты, звязаныя з музейнай і выставачнай тэмай.

«Я працую з прамысловым турызмам. Распрацоўвала канцэпцыю для музея Мінскага гадзіннікавага завода «Прамень». І мая далейшая дзейнасць будзе звязана з прамысловым турызмам. Прамысловасць у нашай краіне развіваецца, і яна можа прывабліваць турыстаў, гэта будзе развіваць эканоміку і саміх прадпрыемстваў. Гэта іміджавая справа, якая зможа даць штуршок рэгіянальным прадпрыемствам», — расказала Дар'я.

Дзяўчына падкрэсліла, што ёй хацелася б актыўна развіваць турызм у нашай краіне, прыцягваць замежных турыстаў і развіваць унутраны турызм. А прыемным успамінам аб універсітэце застанецца ўдзел у розных творчых мерапрыемствах і навуковых канферэнцыях.

«Універсітэт я буду ўспамінаць толькі з цеплынёй. І я вельмі рада, што мне ўдалося пабываць на такім мерапрыемстве і адчуваць сябе тут камфортна», — падзялілася Дар'я.

**Выпускнік факультэта журналістыкі БДУ Мікіта ПАЛЯКЕВІЧ** ужо даўна працуе на тэлеканале АНТ. Таму ён пажадаў усім выпускнікам ВНУ так жа паспяхова знайсці месца працы, як гэта ўдалося яму. І, вядома, захаваць цёплыя ўспаміны аб студэнцкіх гадах. «Сёння ўжо нельга падзяляць вучобу і актыўную дзейнасць ва ўніверсітэце. Гэта паняцці непарыўныя, бо ва ўніверсітэце праходзіць этап станаўлення як асобы. І самае галоўнае ва ўніверсітэце — гэта людзі, з якімі ты вучышся і з якімі ўсё гэта праходзіш», — падкрэсліў ён.

**Даяна ЗАБАЛОЦКАЯ,** якая скончыла Беларускі дзяржаўны аграрна-тэхнічны ўніверсітэт, прызналася, што марыла трапіць на Рэспубліканскі баль. «Ад сённяшняга вечара я ў захапленні: усе такія прыгожыя, свецяцца, вочкі гараць, усе шчаслівыя. Я вельмі хацела сюды трапіць. І вось я тут. Вялікі дзякуй за такую магчымасць», — сказала яна. Дзяўчына атрымала спецыяльнасць менеджара-эканаміста. Сваю прафесійную кар'еру дзяўчына пачне ў Жодзіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ